**КАМЯНІЦА**, вёска ў Ізабелінскім с/с Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса імя Свярдлова. За 18 *км* на Пд ад Ваўкавыска, 110 *км* ад Гродна. 254 ж., двароў 92 (1971). Аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў Айч. вайны.

**КАМЯНПОЛЛЕ**, вёска ў Камянпольскім с/с Міёрскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Праўда». За 5 *км* на З ад Міёраў, 195 *км* ад Віцебска, на аўтамабільнай дарозе Міёры — Браслаў. 196 ж., гасп. 55 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

**КАМЯНЮКІ**, вёска ў Камянецкім р-не Брэсцкай вобл., на р. Правая Лясная. Цэнтр сельсавета і запаведна-паляўнічай гаспадаркі «Белавежская пушча». За 23 *км* на Пн ад Камянца, 63 *км* ад Брэста, 51 *км* ад чыг. ст. Жабінка, канцавы аўтобусны прыпынак на дарозе, якая злучае вёску з Камянцом. 970 ж., двароў 301 (1971). Лесазавод, камбінат быт. абслугоўвання, метэастанцыя, таксідэрмічная майстэрня. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, аптэка, аддз. сувязі, сталовая, рэстаран, 2 магазіны, гасцініца. Дзіцячая турысцкая база, музей прыроды. Ням.-фаш. захопнікі загубілі 30 жыхароў вёскі. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў Айч. вайны.

**КАНА**, японская складовая азбука. Існуе дзве графічныя формы — катакана і хірагана. Вынайдзена ў 8 ст. на аснове графічнага скарачэння кітайскіх іерогліфаў. Сістэма яп. пісьма — мяшанае іерагліф.-літарнае пісьмо.

Алфавіт К. да 1946 складаўся з 48 знакаў, якія абазначалі 5 галосных, паўгалосны і склады з зычных — глухіх і санорных — у спалучэнні з галоснымі. Знакаў было 51, потым 3 адпалі, 2 выключаны паводле рэформы 1946. Сучаснае гукавое значэнне некат. літар не супадае з старажытным.

**КАНАВА**, вёска ў Баханскім с/с Хоцімскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса імя Карла Маркса. За 14 *км* на З ад Хоцімска, 181 *км* ад Магілёва, 32 *км* ад чыг. ст. Камунары. 273 ж., двароў 96 (1971). Пач. школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Каля вёскі (0,4 *км*) помнік 91 земляку, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

**КАНАВАКАПАЛЬНІК**, самаходная машына, прычапная прылада ці навясное абсталяванне да трактара, прызначаныя капаць канавы. Выкарыстоўваюцца на асушцы балотаў, буд-ве арашальных сістэм, сцужачных падмуркаў, пракладцы трубаправодаў, кабельных ліній сувязі, стварэнні дрэнажных сістэм і інш.



Паводле тыпу рабочага органа падзяляюцца на К. з пасіўным рабочым органам (плужныя) і з актыўным. Першымі капаюць канавы з папярочным сячэннем да 1 $м^2$ і глыб. да 1,2 *м*, другімі — з сячэннем больш за 1 $м^2$. Плужныя бываюць адна- і двухадвальныя. Актыўны рабочы К.— фрэза з інерцыйнай разгрузкай ці ... гравітацыйнай разгрузкай грунту. Самаходныя ... шматкаўшовыя экскаватары ротарнага, ... вага ці ланцуговага тыпу на гусеніцах (ЭР-7А, ЭТН-123, ЭТ-121 і інш.) і фрэзерныя ... яны робяць канаву за адзін праход. Грунт ... ваецца стужачным транспарцёрам ці фрэзай ... ныя тыпы К. ствараюцца на Беларусі ... «Меліярмаш», у Цэнтр. НДІ механізацыі і ... трыфікацыі с. гасп. нечарназёмнай зоны ... Мазырскім з-дзе меліярацыйных машын.

*Літ.*: Машины для строительства и содержания осушительных каналов, М., 1969.

*І. І. Леановіч*

**КАНАВАЛАЎ** Дзмітрый Пятровіч [10(22).3.1856, с. Іванаўцы Верхнеднепроўскага пав. Екацярынаслаўскай губ.— 6.1.1929], ... хімік. Акад. АН СССР (1923, чл.-кар. ...). Адзін з заснавальнікаў хім. тэорыі растворыў. Класічныя даследаванні К. па пругкасці пары раствораў (законы К.) — аснова ў раздзяленні вадкіх сумесей перагонкаю. Увёў паняцце актыўнай паверхні, што спрыяла развіццю тэорыі гетэрагеннага каталізу.

*Тв.*: Об упругости пара растворов, 3 изд., Л., 1928.

*Літ.*: Соловьев Ю. И. и Кипнис А. Я. Дмитрий Петрович Коновалов. 1856—1929, М., ...

**КАНАВАЛАЎ** Міхаіл Сямёнавіч (н. ..., г. Каломна Маскоўскай губ.), удзельнік ... на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1941. Вызначыўся на ... Віцебскай вобл. 25.6.1944 першы фарсіраваў Зах. Дзвіну каля в. Балбечча і з групай ... наў на плацдарме адбіў 2 контратакі праціўніка, гэтым садзейнічаў пераправе 2 палкоў. 26.6.1944 з аддзяленнем, перарэзаўшы дарогу каля в. Пяцігорск, памог палку фарсіраваць р. Ула.

**КАНАВАЛАЎ** Павел Міхайлавіч [15(28).... 1906, в. Вочнема Кірылаўскага пав. Ноўгарадскай губ.— 19.6.1969], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Мінскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. З 1928 у Чырв. Арміі. У партызанах з ліст. 1941 — нам. камандзіра, нач. штаба атрада; з студз. 1943 да 18.6.1943 камандзір *партызанскай брыгады № 37* імя А. Я. Пархоменкі Мінскай вобл. З снеж. 1943 у дзеючай арміі. Пасля вайны на гасп. рабоце ў Мінску і ў Асіповіцкім р-не. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

**КАНАВАЛАЎ** Рыгор Васілевіч [н. 5(18).... 1912, в. Лагуны Гомельскага пав. Магілёўскай губ.], дзярж. дзеяч БССР. З сялян. Чл. КПСС з 1938. Скончыў Камуніст. ін-т журналістыкі імя Кірава ў Мінску (1939), ВПШ пры ЦК КПСС (1956). Працаваў у газ. «Чырвоная Палачына» (1933—34), Дзярж. выдавецтве БССР (1938—41). У Айч. вайну на Паўд.-Зах., Ленінградскім, 1-м Укр. франтах. З 1946 у апараце ЦК КПБ: інструктар, заг. сектара, нам. заг. аддзела прапаганды і агітацыі. З 1960 нам. старшыні Дзярж. камітэта па радыёвяшчанні і тэлебачанні пры Савеце Міністраў БССР, з 1963 старшыня Дзярж. камітэта Савета Міністраў БССР па друку. Узнаг. 4 ордэнамі, медалямі.

**КАНАВАЛАЎ** Фёдар Фядулавіч (н. 1910, в. Булдыга Спаскага пав. Тамбоўскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. ...